Уладзімір Е. Снапкоўскі

# Развіццё ўзаемаадносін Беларусь – Еўрапейскі Саюз у пачатку XXI ст.

Wschodnioznawstwo 7, 289-311

2013

Artykuł został opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

Уладзімір Е. Снапкоўскі

# Развіццё ўзаемаадносін Беларусь – Еўрапейскі Саюз у пачатку XXI ст.

## Гістарыяграфія праблемы

Сярод беларускіх даследчыкаў міжнародных адносін праблематыка ўзаемадачыненняў паміж Рэспублікай Беларусь (РБ) і Еўрапейскім Саюзам (ЕС) з'яўляецца адной з прыярытэтных, якой прысвечаны дзесяткі навуковых артыкулаў і некалькі кніжных публікацый. У ліку найбольш змястоўных на наш погляд прац хацелась бы назваць даследаванні В. Карбалевіча, А. Русаковіча, У. Улаховіча, А. Ціхамірава, В. Шадурскага[1]. У апошнія гады выйшла пару кніг, у тым ліку калектыўная манаграфія беларускіх вучоных аб праблемах і перспектывах супрацоўніцтва паміж Беларусю і ЕС, дзе аўтары разам з даследаваннем спрабуюць даць асцярожныя рэкамендацыі

[1] V. Karbalewič, *Stosunki pomiędzy Białorusią a Unią Europejską: nowe tendencje*, [w:] *Białoruś – w stronę zjednoczonej Europy*, M. Maszkiewicz (red.), Wrocław 2009; А. В. Русакович, *Белорусско-германские отношения в конце 2010-2011 гг.: основные аспекты*, [w:] *Беларусь в современном мире = Беларусь у сучасным свеце. Матэрыялы X Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю заснавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Мінск, 28 кастрычніка 2011 г.*, В. Г. Шадурский и др. (ред.), Минск 2011, s. 41-43; А. В. Тихомиров, *Республика Беларусь – Евросоюз: от сотрудничества к охлаждению отношений (1992–1997 гг.)*, [w:] *Европейский Союз: История, политика, экономика, право*, Минск 1998, s. 56-62; idem, *Отношения Республики Беларусь с Европейским Союзом: состояния и перспективы развития*, http://www.cis-center.ru/index.php?option=com_content&view=article&id=817:2011-03-28-19-12-46&catid=54:29-31--2011-&Itemid=100070 (7 III 2012); В. Улахович, *Отношения между Республикой Беларусь и Европейским Союзом: состояние и перспективы развития*, „Экономический вестник" 2001, Вып. 1, № 2, s. 336-347; idem, *Формирование основ внешней политики Республики Беларусь (1991-2005 гг.)*, Минск 2009; В. Шадурский, *Отношения Республики Беларусь и Европейского Союза: внутренний и внешний контекст*, „Белорусский журнал международного права и международных отношений" 2003, № 1, http://www.evolutio.info/index.php?option=com_content&task=view&id=611&Itemid=54 (29 V 2011); idem, *Беларусь в „Восточном партнерстве": поиск баланса интересов*, „Восточная Европа. Перспективы" 2011, № 1, s. 39-49.

і прапановы па нармалізацыі і развіцці беларуска-еўрапейскіх адносін[2]. Указанай тэматыкай, у тым ліку на старонках польскага навуковага друку, займаецца і аўтар дадзенага артыкула[3].

Як слушна заўважае польскі даследчык Я. Мірановіч, у Беларусі вельмі інтэнсіўна разгортваюцца навуковыя даследаванні знешняй палітыкі дзяржавы, аднак назапашаны вялікі запас ведаў рэдка знаходзіць увасабленне ў публікацыях, „дзе аўтары вельмі асцярожна фармулююць уласныя думкі і разважанні. Абавязковы ў Беларусі ўзор *палітычнай карэктнасці* аказвае моцны ўплыў на канчатковую форму прац паліталагічнага характару”[4]. Гэта слушная заўвага несумненна абгрунтаваная. Яна паказвае акрэсленыя межы, за якія цяжка выйсці беларускім даследчыкам, якія працуюць у дзяржаўных установах, у аналізе знешнепалітычнай дзейнасці сучаснай беларускай дзяржавы.

Такіх цяжкасцей не ведаюць ці ўжо прайшлі замежныя калегі. Па шэрагу прычын іх прыцягвае знешняя палітыка постсавецкай Беларусі. Толькі ў Польшчы па гэтай тэме з 2003 г. выйшла пяць кніжак аўтарства К. Маляка, Я. Мірановіча, Р. Чахора, А. Эберхарда і калектыву Люблінскага ўніверсітэта[5]. Адпаведныя раздзелы гэтых прац прысвечаны беларуска-еўрапейскім адносінам[6]. Сярод англамоўнай літаратуры да гэтай тэматыкі найбліжэй стаяць калектыўныя інтэрнацыянальныя працы, выдадзеныя ў Гарвардзе і Лондане[7].

Мэтай артыкула з’яўляецца разгляд адносін паміж Беларуссю і ЕС у палітычнай і эканамічнай галінах у пачатку XXI ст. Больш дакладны перыяд даследавання ахоплівае час ад пачатку новай пакрокавай стратэгіі ЕС адносна

---

2 *Республика Беларусь – Европейский союз: проблемы и перспективы сотрудничества*, Минск 2013.

3 Гл. У. Е. Снапкоўскі, *Адносіны Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім саюзам: ад ізаляцыі да нармалізацыі*, „Труды факультета международных отношений. Научный сборник” 2010, Выпуск I, s. 38-43; idem, *Асноўныя этапы развіцця адносін Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім саюзам*, [w:] *Республика Беларусь – Европейский союз…*; idem, *Białoruś – Unia Europejska: trudne drogi rozwoju stosunków*, „Politeja. Pismo Wydziału Studiów Międzynarodowych i Politycznych Uniwersytetu Jagiellońskiego” 2012, nr 4/1 (22/1): „Studia Białoruskie”, s. 23-52.

4 E. Mironowicz, *Polityka zagraniczna Białorusi 1990-2010*, Białystok 2011, s. 11.

5 *Białoruś w stosunkach międzynarodowych*, W. Topolski (red), Lublin 2009; R. Czachor, *Polityka zagraniczna Republiki Białoruś w latach 1991-2011. Studium politologiczne*, Polkowice 2011; A. Eberhardt, *Gra pozorów: Stosunki rosyjsko-białoruskie 1991-2008*, Warszawa 2008; K. Malak, *Polityka zagraniczna i bezpieczeństwa Białorusi*, Warszawa 2003; E. Mironowicz, *op.cit.*

6 Гл. напр.: A. Dumała, *Stosunki Unii Europejskiej z Białorusią*, [w:] *Białoruś w stosunkach…*, s. 275-302.

7 *Independent Belarus. Domestic Determinations, Regional Dynamics, and Implications for the West*, Cambridge 2002; *The EU and Belarus. Between Moscow and Brussels*, London 2002.

Беларусі (рубеж 2001-2002 гг.) да канца 2012 г., калі беларуска-еўрапейскія адносіны заставаліся ў замарожаным выглядзе, адчуваючы на сябе непераадоленыя наступствы рэзкага пагаршэння, што наступіла пасля падвядзення вынікаў прэзідэнцкай кампаніі ў Мінску 19-20 снежня 2010 г.

## Кароткі агляд адносін паміж РБ і ЕС у 1990-я гады

У пачатку прадставім. Дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Еўрапейскімі супольнасцямі былі ўсталяваны ў жніўні 1992 г. Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве (ППС) паміж Рэспублікай Беларусь і Еўрапейскімі супольнасцямі было падпісана 6 сакавіка 1995 г. у час візіта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў Брусель і ратыфікавана Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 12 красавіка 1995 г.[8]. На працягу 1995-1996 гг. ППС было ратыфікавана парламентамі 9-ці дзяржаў ЕС: Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Даніі, Грэцыі, Германіі, Ірландыі, Іспаніі, Італіі і Швецыі. Бундэстаг ФРГ, ратыфікаваўшы ППС, не зрабіў адпаведную натыфікацыю[9]. МЗС Беларусі неаднаразова выказваў пажаданне аднаўлення працэса ратыфікацыі Пагаднення, аднак да гэтага не быў гатовы ЕС[10].

26 сакавіка 1996 г. падчас візіта прэм'ер-міністра Рэспублікай Беларусь М. Чыгіра ў Брусель было падпісана Часовае пагадненне аб гандлі і пытаннях, што маюць дачыненне да гандлю (ЧПГ) паміж Рэспублікай Беларусь і ЕС. Гэта пагадненне ўводзіла ў дзеянне гандлёва-эканамічную частку ППС і павінна было дзейнічаць да ўступлення ў сілу ППС. Беларусь выканала ўсе неабходныя ўнутрыдзяржаўныя працэдуры для яго ўступлення ў сілу. Аднак у адпаведнасці з заключэннем Савета ЕС ад 15 верасня 1997 г. (гл. ніжэй) дзеянне Часовага пагаднення таксама было прыпынена. Нягледзячы на гэта ЕС прадставіў Беларусі рэжымнай больша гаспрыяння (РНС) у гандлі. Акрамя таго, ЕС у аднабаковым парадку прымяняў да Беларусі з 1 студзеня 1993 г. да чэрвеня 2007 г. Агульную сістэму прэферэнцый (АСП) ці мытных ільготаў у гандлі, у адпаведнасці з якім беларускія тавары імпартаваліся ў ЕС бяспошліннаці па зніжаных адноснаставак РНС

---

8 Гл. *Соглашение о партнерстве и сотрудничестве между Европейскими Сообществами и их Государствами-Членами и Республикой Беларусь (Подписано 6 марта 1995 г.)*, „Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь” 1996, № 1-2, s. 75-144.

9 http://www.mfa.gov.by/mulateral/-organizations/list (7 III 2011). У верасні 1997 г. у адпаведнасці з заключэннем Савета ЕС яго ратыфікацыя дзяржавамі-членамі ЕС была прыпынена і яно не ўступіла ў сілу. ППС уступіць у сілу пасля яго ратыфікацыі парламентамі ўсіх краін-членаў ЕС і Еўрапейскім Парламентам.

10 В. Улахович, *Формирование…*, s. 193-195; В. Шадурский, Реализация принципа многовекторности в белорусской внешней политике, „Труды факультета международных отношений. Научный сборник” 2010, Выпуск I, s. 50.

мытныхтарыфах. Абмежаванні захоўваліся толькі ў адносінах да беларускага тэкстылю і калійных угнаенняў. Сістэма АСП ужывалася ЕС да 176 найбяднейшых краін і тэрыторый свету. ЕС таксама падтрымліваў імкненне Беларусі да ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, якое яна абвясціла ў 1993 г.[11].

Еўрапейскі Саюз увайшоў у склад ключавых знешнегандлёвых партнёраў Беларусі, заняўшы другую пазіцыю пасля Расіі. У 1995 г. тавараабарот паміж Беларуссю і ЕС дасягнуў 1,5 млрд. дол. ЗША. Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця выдзеліў для Беларусі 30 млн дол. ЗША ў якасці дапамогі для развіцця банкаўскага сектара і малога і сярэдняга бізнесу[12]. Паспяхова развіваліся сувязі ў сферах адукацыі, навукі і культуры. Дзяржавы ЕС уваходзілі ў склад лідэраў па аказанні Беларусі дапамогі ў справе ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Пасля канстытуцыйнага рэферэндума 24 лістапада 1996 г. адбылося пагаршэнне адносін паміж Беларуссю і ЕС. Еўрапарламент прыпыніў працэс ратыфікацыі СПС і ўвядзення ў дзеянне Часовага пагаднення аб гандлі, а потым прыняў рэзалюцыю з асуджэннем канстытуцыйных змен у Беларусі. Дзяржавы-члены ЕС і яго органы адмовіліся прызнаць яго вынікі і легітымнасць Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, спаслаўшыся на тое, што ён не быў сфарміраваны на выбарнай аснове. 13 студзеня 1997 г. Парламенцкая асамблея Савета Еўропы прыпыніла статус „спецыяльна запрошанага" для Беларусі. 15 верасня 1997 г. Савет ЕС прыняў заключэнне аб адносінах Еўрапейскага Саюза з Беларуссю з 7 пунктаў, якое ўводзіла абмежаванні ў адносінах з беларускімі ўладамі, у тым ліку на кантакты на міністэрскім узроўні. Савет ЕС адзначыў, што адносіны паміж ЕС і Рэспублікай Беларусь змогуць развівацца далей толькі ў тым выпадку, калі беларускія ўлады вернуцца на шлях павагі правоў і асноўных свабод грамадзян, выканання канстытуцыйных прынцыпаў, якія ствараюць асновы дэмакратычнай прававой дзяржавы[13]. Гэта заключэнне застаецца па сутнасці важнейшым рашэннем ЕС адносна Беларусі, якое стварыла новыя палітычныя і прававыя рамкі для ўзаемаадносін паміж гэтай супольнасцю і нашай краінай.

19 верасня 1997 г. МЗС Беларусі выступіла з заявай, у якой рашэнне Савета ЕС расцэньвалася як „прамое даўленне на развіццё ўнутрыпалітычных працэсаў у суверэннай дзяржаве". Канстатавалася, што Беларусь адвяргае „мову ўльтыматумаў і дыктату", аднак гатова да дыялогу з ЕС на прынцыпе

---

[11] A. Dumała, *op.cit.*, s. 290-291.

[12] R. Zięba, *Wspólna Polityka Zagraniczna i Bezpieczeństwa Unii Europejskiej*, Warszawa 2007, s. 171.

[13] *Выводы Совета по общим делам от 15 сентября по отношениям Европейского Союза с Беларусью*, „Белорусская газета", 22 IX 1997, s. 5.

„захавання раўнапраўя бакоў і павагі рэальнасцей"[14]. Як адзначае Я. Мірановіч, такая форма рэакцыі ўлад Беларусі на рашэнні ўнійных інстытуцый стала нормай у двухбаковых адносінах. У Мінску ўсялякую крытыку ўнутранай палітыкі з боку ЕС трактавалі як умяшанне ў справы суверэннай дзяржавы[15].

Новае абвастрэнне адносін адбылося ў чэрвені 1998 г. у сувязі з канфліктам вакол дыпламатычнага комплекса „Дразды", што размяшчаўся каля рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.Беларускія ўлады запатрабавалі ад паслоў 22 дзяржаў пакінуць памяшканні рэзідэнцый у „Драздах", спаслаўшыся на неабходнасць рамонту камунікацый. Паслы дзяржаў – членаў ЕС адмовіліся выканаць гэта патрабаванне і пакінулі Мінск, у той час як беларускія паслы ў адпаведных краінах былі вымушаны вярнуцца ў Беларусь. У адказ у ліпені 1998 г. ЕС упершыню абмежаваў права ўезду беларускіх службовых асобаў на тэрыторыю дзяржаў-членаў. Польскі даследчык К.Малак наступным чынам ацаніў дзеянні ўлад ЕС:

> Брусель тады рашыўся на вельмі рашучы крок, які рэдка сустракаўся ў гісторыі сусветнай дыпламатыі. У адказ на цяжкую абразу сваіх паслоў, якую дапусціў беларускі прэзідэнт, гэтыя краіны салідарна прынялі рашэнне аб забароне ўезду на тэрыторыю дзяржаў ЕС для самаго Лукашэнкі і 130 найвызшых прадстаўнікоў яго адміністрацыі[16].

У снежні 1998 г. дыпламатычны інцыдэнт быў урэгуляваны на кампраміснай аснове. У лютым 1999 г. Еўрасаюз адмяніў абмежаванні на ўезд у шэнгенскую прастору афіцыйных асобаў з Беларусі. Парламенцкія выбары 2000 і прэзідэнцкія выбары 2001 гг. адбыліся па ранейшым сцэнарыі і не прывялі да змен у палітыцы беларускіх улад, на што спадзяваліся дзяржавы ЕС.

## Пакрокавая стратэгія ЕС у 2002-2008 гг.

У пачатку 2002 г. ЕС зрабіў спробы паступовай нармалізацыі адносін у адпаведнасці з новым падыходам, які атрымаў назву „пакрокавай стратэгіі" („step-by-stepapproach"). ЕС заявіў аб прынцыповай гатоўнасці да дыялогу з прадстаўнікамі беларускіх улад на падставе крокаў насустрач, якія

---

[14] *Заява МЗС Рэспублікі Беларусь аб заключэнні Савета Еўрапейскага Саюза аб узаемаадносінах Еўрапейскага Саюза з Беларуссю*, [w:] *Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў (1996-2000 гг.)*, Минск 2008, s. 140.

[15] E. Mironowicz, *op.cit.*, s. 111.

[16] K. Malak, *op.cit.*, s. 75.

прадугледжвалі б дэмакратызацыю выбарчага працэса ў краіне, пашырэнне паўнамоцтваў парламента, паляпшэнне сітуацыі ў галіне сродкаў масавай інфармацыі, выкананне асноўных правоў і свабод чалавека, спыненне праследванняў апазіцыі. Размовы, якія праводзіліся праз кіраўніка місіі ЕС у Мінску, не прынеслі аднак канкрэтных вынікаў і былі спынены. Адной з галоўных прычын гэтага была спрэчка вакол мандата КНГ АБСЕ у Мінску. Беларускія ўлады вырашылі ў верасні 2002 г. не працягваць акрэдытацыі для замежнага персанала Групы, што дэ факта рабіла немагчымай працяг яе дзейнасці[17]. У якасці рэакцыі на спыненне дзейнасці КНГ у Мінску 14 з 15 краін ЕС 19 лістапада 2002 г. прынялі рашэнне ўвесці забарону на ўезд на іх тэрыторыю прэзідэнта А.Лукашэнкі і сямі іншых высокапастаўленых службовых асоб Беларусі. Раней такое ж рашэнне прыняў урад Чэхіі, які адмовіўся выдаць візы афіцыйнай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў саміце Савета еўраатлантычнага партнёрства ў Празе 21–22 лістапада 2002 г. Беларускі бок адрэагаваў на гэта заявай МЗС і каментарыям прэс-сакратара МЗС[18]. Візавая забарона 14 краін ЕС для прэзідэнта А. Лукашэнкі і 7 іншых высокапастаўленых службовых асоб Беларусі была знята ў сакавіку 2003 г. пасля адкрыцця новага Офіса АБСЕ ў Мінску і станоўчай ацэнкі кіраўніка Офіса[19].

Рэспубліка Беларусь пазітыўна ацаніла такі новы элемент агульнай знешняй палітыкі ЕС як Еўрапейская палітыка суседства (ЕПС)[20]. Еўрапейская камісія ў стратэгічным дакуменце ЕПС ад 12 мая 2004 г. накіравала канкрэтныя прапановы для Беларусі, падкрэсліўшы пры гэтым, што ў сувязі з палітычнай сітуацыяй яна не можа карыстаца ўсімі дабротамі ЕПС. Савет ЕСу сваім рашэнні ад 23 лістапада 2004 г. агучыў заклапочанасць з прычыны таго, што парламенцкія выбары ў кастрычніку 2004 г. і рэферэндум не праводзіліся адкрытым і сумленным спосабам[21]. Гэтым рашэннем Са-

---

17 *Каментарый прэс-сакратара МЗС Рэспублікі Беларусь П. Латушкі адносна развіцця супрацоўніцтва Беларусі з АБСЕ 11 верасня 2002 г.*, „Веснік Міністэрства замежных спраў [РБ]" 2002, №4, s. 43.

18 *Заява Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь аб нядопуску беларускай дэлегацыі ў Чэхію на пасяджэнне Саміта Савета еўраатлантычнага партнёрства 16 лістапада 2002 г.*, „Веснік Міністэрства замежных спраў [РБ]" 2002, №4, s. 33-34; *Каментарый прэс-сакратара МЗС Рэспублікі Беларусь П. Латушкі адносна разгляду Саветам ЕС пытання аб Беларусі 20 лістапада 2002 г.*, „Веснік Міністэрства замежных спраў [РБ]" 2002, №4, s. 45.

19 Гл. *Паведамленне МЗС Рэспублікі Беларусь аб візіце дэлегацыі Рабочай групы па Беларусі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ 8 лютага 2003 г.*, „Веснік Міністэрства замежных спраў [РБ]" 2003, №1, s. 125.

20 В. Улахович, *Формирование…*, s. 193.

21 *Еўрапейскі Саюз. Храналогія двухбаковых адносін*, http://eeas.europa.eu/delegations/belarus/eu_belarus/chronology/index_be.htm (21 II 2012); A. Dumała, *op.cit.*, s. 277-278.

вет ЕС паклаў пачатак двухкаляёвай палітыцы адносна Беларусі – цвёрдай і пасіўнай адносна рэжыму і мяккай і актыўнай адносна грамадства[22].

Пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, што адбыліся ў сакавіку 2006 г., і ў развіццё гэтай палітыкі 21 лістапада 2006 г. Еўрапейская Камісія прыняла неафіцыйны дакумент (non-paper) пад назвай „Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі", у якім прапанавала Беларусі стаць паўнапраўным удзельнікам ЕПД і, такім чынам, паўнапраўным партнёрам ЕС, што дазволіць яму дапамагчы палепшыць якасць жыцця беларусаў. ЕС прапанаваў у прыватнасці шэраг паляпшэнняў (12 пунктаў), якімі б непасрэдна скарыстаўся беларускі народ: спрошчанае наведванне беларускімі грамадзянамі краін-сябраў ЕС; пашыранае трансгранічнае супрацоўніцтва, падтрымка беларускай эканомікі, дапамога ў развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, мадэрнізацыя транспартнай і энергетычнай сістэмы, падтрымка ўразлівых груп насельніцтва; паляпшэнне дзяржаўнага і мясцовага кіравання, сістэмы аховы здароўя і адукацыі, падтрымка ў барацьбе з наступствамі Чарнобыльскай катастрофы. Узамен ЕС жадаў, каб беларускія ўлады зрабілі істотныя крокі насустрач дэмакратызацыі і заявіў аб гатоўнасці аднавіць свае адносіны з Рэспублікай Беларусь і яе народам, як толькі беларускі ўрад прадэманструе павагу да дэмакратычных каштоўнасцяў і асноўных правоў народа Беларусі[23].

І хаця афіцыйны Мінск не даў пазітыўнага адказу на гэты дакумент, аднак наступныя падзеі засведчылі, што беларускія ўлады пачалі тэарэтычнае пераасэнсаванне і практычную падрыхтоўку да таго, каб прыняць шматабяцальныя прапановы ЕС і пачаць перагаворны працэс з Бруселем без папярэдніх умоў. Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка неаднаразова выражаў гатоўнасць да нармалізацыі адносін з ЕС на раўнапраўных асновах. У штогадовым пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 24 красавіка 2007 г. была выказана зацікаўленасць Беларусі ў нармальных узаемавыгадных адносінах з Еўрасаюзам і ЗША, для паўнацэннага дыялогу з якімі, як сказаў дакладчык, склаліся ўсе перадумовы. Была падкрэслена гатоўнасць афіцыйнага Мінска абмяркоўваць любыя тэмы і вострыя дыскусійныя пытанні. Аднак для гэтага неабходны двухбаковы настрой на канструктыўны дыялог і жаданне знаходзіць узаемапрымальныя рашэнні. Адначасова А. Лукашэнка адзначыў непрымальнасць для Беларусі якіх-небудзь інспектараў, кантралёраў ці настаўнікаў[24].

---

22 A. Dumała, *op.cit.*, s. 278.

23 *Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі*, http://www.delblr.ec.europa.eu/page3247.html (7 III 2009).

24 *Ежегодное послание Президента Республики Беларусь белорусскому народу и Национальному собранию 24 красавіка 2007 г.*, http://www.president.gov.by/press49984.html#doc (7 III 2009).

## У 2008-2010 гг. у адносінах Беларусі з ЕС адбылося пацяпленне

У Мінску адкрылася Прадстаўніцтва Камісіі Еўрапейскіх супольнасцяў. Для паляпшэння адносін у 2008 г. узнікла некалькіх перадумоў. Па-першае, гэта цяжкасці ў развіцці адносін паміж Мінскам і Масквой, якую беларускі прэзідэнт абвінавачваў у „вялікадзяржаўнасці" і эканамічным прагматызме. У геапалітычнай гульне з Расіяй ён вырашыў выкарыстаць еўрапейскую карту. Па-другое, гэта расійска-грузінскі канфлікт, у ходзе якога Беларусь не заняла адназначна прарасійскай пазіцыі, нават спачатку гаварыла пра свой нейтралітэт, а потым адмовілася прызнаць незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Можна меркаваць, што гэты крок быў належным чынам ацэнены ЕС. Па-трэцяе, станоўчы водгук ў еўрапейскіх сталіцах выклікала вызваленне беларускімі ўладамі палітычных зняволеных (у першую чаргу экс-кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах 2006 г. А. Казуліна). Савет ЕС у дэкларацыі старшынства ад 27 жніўня 2008 г. заявіў, што ў Беларусі ўжо няма палітычных зняволеных. Адначасова гэта ўзбудзіла ў ЕС надзеі на пачатак дэмакратызацыі і дыялогу на тэму партнёрства і ўдзелу ў ЕПС. У кастрычніку 2008 г. Савет міністраў замежных спраў ЕС прыпыніў дзеянне візавых абмежаванняў у дачыненні да беларускіх службовых асобаў на адзін год[25], а ў лістападзе 2009 г. працягнуў адпаведнае рашэнне яшчэ на год[26].

Дынамічна і адначасова даволі супярэчліва развіваліся адносіны паміж Беларуссю і ЕС ў 2009 і на працягу амаль усяго 2010 г. 18-19 лютага 2009 г. Мінск наведаў Генеральны сакратар па знешняй палітыцы і бяспецы ЕС Хаўер Салана. Гэты быў першы візіт у Беларусь высокапастаўленага прадстаўніка ЕС пасля лістападаўскага рэферэндума 1996 г. Ён меў сустрэчы з прэзідэнтам А. Лукашэнкам, міністрам замежных спраў С. Мартынавым, прадстаўнікамі апазіцыі. Свой візіт ён назваў пачаткам „больш глыбокіх і цесных адносін паміж ЕС і Беларуссю", якая з'яўляецца важнай краінай для Еўрасаюза. Пасля сустрэчы з А. Лукашэнкам Х. Салана заявіў журналістам: „Я не прыехаў сюды з нейкімі ўмовамі. Еўрасаюз умее выбудоўваць стасункі з іншымі краінамі без ўмоваў. Наша сустрэча была вельмі канструктыўнай і добразычлівай"[27]. А. Лукашэнка выклаў пазіцыю беларускага боку: у дыя-

[25] А. А. Скрипко, *Актуальные вопросы развития отношений Республики Беларусь с Европейским Союзом, в том числе в рамках „Восточного партнерства": проблемы и перспективы*, [w:] *Беларусь в современном мире: Материалы VIII Междунар. науч. конф., посвящ. 88-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 30 окт. 2009 г.*, В. Г. Шадурский и др. (ред.), Минск 2009, s. 14; *External relations Council meeting, Luxembourg, 13 October 2008*, http://www.consilium.europa.eu/uedocs/cms_data/docs/pressdata/en/gena/103371.pdf (5 VI 2011).

[26] *Еўрапейскі Саюз. Храналогія…*, A. Dumała, *op.cit.*, s. 282.

[27] Цыт. па: М. Бугай, З. Панкавец, *Працэс пайшоў*, „Наша Ніва", 25 II 2009, s. 3.

логу паміж афіцыйным Мінскам і ЕС трэба выключыць пасрэднікаў як унутры краіны, так і замежжам. Ёе таксама адзначыў непажаданасць гандлю паміж Мінскам і Бруселем па эканамічных і палітычных пытаннях[28].

7 мая ў Празе адбыўся ўстаноўчы саміт па праграме ЕС „Усходняе партнёрства", у якім прынялі ўдзел 27 дзяржаў-членаў ЕС і 6 постсавецкіх дзяржаў (Арменія, Азербайджан, Беларусь, Грузія, Малдова і Украіна)[29]. У склад беларускай дэлегацыі ўваходзілі першы намеснік прэм'ер-міністра У. Сямашка і міністр замежных спраў С. Мартынаў. Беларуская дэлагацыя прадставіла афіцыйную пазіцыю Беларусі па развіцці ўзаемадзяення з ЕС у рамках Усходняга партнёрства. Яна заключалася ў тым, каб гэтая праграма будавалася на прынцыпах роўнапраўя, уліку інтарэсаў і спецыфікі кожнай дзяржавы-ўдзельніцы. Усходняе партнёртства не павінна ператварацца ў інструмент барацьбы за сферы ўплыву, а служыць інтарэсам усіж дзяржаў рэгіёна і выключаць паяўленне новых ліній падзелу ў Еўропе. На саміце беларускі бок прадставіў прыярытэтныя інвестыцыйныя праекты ў галіне транзітнай інфраструктуры, энергазабеспячэння, мытнага і пагранічнага кантролю з ЕС для рэадізацыі ў рамках Усходняга партнёрства[30].

22 чэрвеня Мінск наведала камісар ЕС па знешніх сувязях Беніта Ферэра-Вальднер. „Калі беларусы выберуць Еўропу, іх будуць чакаць з абдымкамі" – заявіла яна. А. Лукашэнка прызнаўся, што Беларусь не можа без супрацоўніцтва з Еўропай „далей развіваць эканоміку"[31]. Ён выказаў сваё бачанне таго, чаго чакае ад ЕС:

> Чего мы хотим от Европы? Чтобы европейцы понимали, что Беларусь – не только географический центр этого континента, здесь живут очень порядочные, честные, трудолюбивые люди, здесь существует независимое суверенное государство, и посягать на это, как бы кому – то не хотелось, мы позволить не можем[32].

Еўракамісар абмянялася з С. Мартынавым тэкстамі мемарандума аб узаемаразуменні ў галіне энергетыкі і прывезла ў Мінск 10 млн еўра на прадуктовыя праграмы[33].

---

[28] *Беларуси и Европейскому союзу в развитии диалога следует исключить посредников*, http://www.president.gov.by/press60415.html#doc (7 III 2009).

[29] Об участии белорусской делегации в учредительном саммите инициативы „Восточное партнерство" ЕС, http://www.mfa.gov.by/print/ru/press/news/e8fe903c66186625.html/ (7 III 2009).

[30] *Ibidem*.

[31] Цыт. па: С. Печанко, А. Класкоўскі, *Шлюб па разліку*, „Наша Ніва", 24 VI 2009, s. 1.

[32] Беларусь искренне желает построить с Европейским союзом хорошие отношения (22 VI 2009), http://www.president.gov.by/press72707.html (7 III 2012).

[33] С. Печанко, А. Класкоўскі, *op.cit*.

У 2009 г. прэзідэнт А. Лукашэнка наведаў з афіцыйнымі візітамі Ватыкан, Італію і Літву, дзе быў прыняты на вышэйшым узроўні. Гэта быў дыпламатычны прарыў пасля 13-гадовай ізаляцыі[34]. 30 лістапада афіцыйны візіт у Мінск зрабіў прэм'ер-міністр Італіі С. Берлусконі, першы кіраўнік урада заходняй дзяржавы пасля лістапада 1996 г.[35]. Некалькі разоў на працягу года беларускі міністр замежных спраў сустракаўся ў Бруселі з кіруючай тройкай ЕС. Больш шырокім патокам пацяклі у Беларусь крэдыты з Захаду: ад МВФ, Сусветнага банку; пачаліся перагаворы аб выдзяленні крэдытаў з боку ЕС і Еўрапейскага банку рэканструкцыі і развіцця.

17 лістапада 2009 г. Савет ЕС прыняў Рашэнне па Беларусі, якім падцвярджаўгатоўнасць ЕС пашырыць адносіны з ёю ў залежнасці ад далейшых змен на шляху да дэмакратыі, павагі да праў чалавека і вяршэнства закона. З улікам прагрэсу ў гэтых сферах было заяўлена аб гатоўнасці зрабіць крокі на шляху павышэння дагаворных адносін з Беларуссю[36].

Новае абвастрэнне сітуацыі вакол Саюза палякаў на Беларусі ў пачатку 2010 г. азначала азначала канец мядовага месяца ў адносінах паміж Беларуссю і ЕС. Разлік ЕС падштурхнуць беларускія ўлады да дэмакратызацыі з дапамогай дыялогу не спраўдзіўся (яны не пайшлі на рыначныя рэформы, прыпынілі перагаворы аб уступленні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю, уступіўшы ў мытны саюз з Расіяй і Казахстанам). Беларускія ўлады таксама расчараваліся ў супрацоўніцтве з ЕС, не атрымаўшы чакаемых фінансавых выгад ад удзелу ва Усходнім партнёрстве, патоку еўрапейскіх інвестыйцый. Дыялог з ЕС не спрацаваў і як сродак уціску на Расію, якую Мінск хацеў запалохаць сваім збліжэнннем з Еўропай[37].

Аднак ЕС спадзяваўся на правядзенне прэзідэнцкіх выбараў у снежні 2010 г. у лепшай атмасферы ў параўнанні з папярэднімі, что ў прынцыпе і было зроблена беларускімі ўладамі. Сігнал ЕС быў ясна паказаны ў час візіту 2 лістапада ў Мінск міністраў замежных спраў Германіі і Польшчы Г. Вестэрвеле і Р. Сікорскага і іх сустрэчы з А. Лукашэнкам. Г. Вестэрвеле адзначыў, што візіт двух міністраў замежных спраў сведчыць аб жаданні Еўрапейскага саюза разглядаць Беларусь не толькі як суседа, але і добрага партнёра і выказаў зацікаўленасць і гатоўнасць развіваць эканамічнае супрацоўніцтва з Беларуссю[38].

---

[34] У. Е. Снапкоўскі, *Адносіны…*, s. 38-42.

[35] *Беларусь рассматривает Италию как значимого политического и экономического партнера в Европе*, http://www.president.gov.by/press80300.html#doc (7 III 2009).

[36] *Еўрапейскі Саюз. Храналогія…*

[37] В. Карбалевич, *Конец медового месяца*, „Свободные новости плюс", 24 II-3 III 2010, s. 2.

[38] *2 ноября [2010 г.] Александр Лукашенко встретился с министрами иностранных дел Германии и Польши*, http://www.president.gov.by/press95372.html#doc (21 V 2011).

У дакладзе на Чацвёртым Усебеларускім з’ездзе 6 снежня 2010 г. А. Лукашэнка вылучыў тэзіс, які неаднаразова агучваўся ім у апошнія гады і які, на думку экспертаў, азначаў імкненне да фактычнай роўнаўдаленасці Беларусі ад Усхода і Захада[39]. Паводле слоў прэзідэнта,

> найбольш аптымальнай для Беларусі з’яўляецца стратэгія „роўнай набліжанасці” да Усхода і Захада. Іменна яна дае шанец максімальна эфектыўна выкарыстоўваць выгаднае геаграфічнае становішча, транзітны і прамысловы патэнцыял нашай краіны[40].

Але пасля адкату ў адносінах з ЕС тэзіс аб роўнаўдаленасці Беларусі ад Усхода і Захада ці „беларускіх арэляў” быў зняты.

## Адкат пасля снежаньскіх 2010 г. падзей у Мінску

Працэс нармалізацыі беларуска-еўрапейскіх адносін аказаўся аднак перарваны ў выніку падзей, што адбыліся ў Мінску 19-20 снежня 2010 г. ЕС не прызнаў як свабодныя, справядлівыя і празрыстыя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі, асудзіў рэпрэсіі ўлад адносна прадстаўнікоў апазіцыі і грамадзянскай супольнасці і заклікаў неадкладна вызваліць удзельнікаў масавых акцый пратэсту супраць абвяшчаных Цэнтральнай выбарчай камісіяй вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, паводле якіх бясспрэчную перамогу на іх атрымаў дзеючы прэзідэнт А. Лукашэнка.

На прэс-канферэнцыі для прадстаўнікоў айчынных і замежных СМІ 20 снежня А. Лукашэнка заявіў, што „мадэль развіцця Беларусі будзе ўдасканальвацца без карэнных ломак”. Ён выказаў пэўны аптымізм адносна перспектыў развіцця супрацоўніцтва з ЕС, адзначыўшы, што папярэдняе заключэнне місіі АБСЕ па назіранні за выбарамі дазволіць Беларусі развіваць гэтыя адносіны[41]. Аднак пасля апублікавання заключэння місіі АБСЕ, якое не прызнавала выбары як справядлівыя і дэмакратычныя, беларускія ўлады заявілі 31 снежня 2010 г. аб непрадленні мандата офіса АБСЕ ў Мінску[42].

---

39 Гл. У. Е. Снапкоўскі, *Аб новых момантах знешняй палітыкі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі*, [w:] *Беларусь в современном мире: Материалы VIII…*, s. 54-56.

40 *Наш исторический выбор – независимая, сильная и процветающая Беларусь: доклад Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко на четвертом Всебелорусском народном собрании*, „Советская Белоруссия”, 7 XII 2010, s. 1-9.

41 *20 декабря [2010 г.] Александр Лукашенко провел пресс-конференцию для представителей отечественных и зарубежных СМИ*, http://www.president.gov.by/press104953.html#doc (21 V 2011).

42 http://www.auswaertiges-amt.de/DE/Aussenpolitik/Laender/Aktuelle_Artikel/Belarus/110103-BMzuBelarus.html (21 V 2011).

Прадстаўнік беларускага МЗС адзначыў, што гэта „свядомае рашэнне, якое абумоўлена адсутнасцю аб'ектыўных прычын для захавання місіі АБСЕ ў Беларусі"[43].

20 снежня ў сумеснай заяве міністры замежных спраў Германіі і Польшчы Г. Вестэрвеле і Р. Сікорскі ацанілі прэзідэнцкія выбары ў Беларусі як не адпавядаючыя дэмакратычным стандартам і асудзілі праследванні апазіцыі[44]. Вярхоўны прадстаўнік ЕС па знешняй палітыцы К. Эштан і дзяржаўны сакратар ЗША Х. Клінтан у сумеснай заяве заклікалі беларускія ўлады вызваліць усіх затрыманых, у тым ліку кандыдатаў у прэзідэнты, і заявілі аб магчымасці перагляду адносін з Беларуссю[45]. Міністры замежных спраў чатырох дзяржаў ЕС – Германіі, Швецыі, Чэхіі і Польшчы – сумесна апублікавалі 23 снежня 2010 г. у газеце „International Herald Tribun" артыкул, у якім ставілася пад сумненне перамога А. Лукашэнкі на выбарах, як і ідэя працягу з ім якіх-небудзь спраў[46].

12 студзеня 2011 г. канцлер ФРГ А. Меркель на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Італіі С. Берлусконі выказалася за аднаўленне Еўрапейскім саюзам санкцый супраць беларускага кіраўніцтва. Пры гэтым еўрапейскія палітыкі і эксперты досыць рэалістычна падыходзілі да праблемы ўвядзення санкцый, у прыватнасці, была адзначана неэфектыўнасць санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі ў папярэднія гады, выказваліся думкі, што жорсткая рэакцыя заходніх краін справакуе рэзкі дрэйф Беларусі ў бок Расіі[47].

20 студзеня і 31 студзеня 2011 г. адпаведна Еўрапейскі парламент і Савет ЕС прынялі рэзалюцыю[48] і заключэнне, дзе асуджаліся мерапрыемствы беларускіх улад у дзень правядзення выбараў і пасля іх, патрабавалася вызваліць арыштаваных і спыніць праследванне апазіцыі. Змяшчаўся заклік да ўлад адмяніць рашэнне аб закрыцці офіса АБСЕ ў Мінску. Заключэнне

[43] *Комментарий начальника Управления информации — пресс-секретаря МИД Беларуси Андрея Савиных в связи с решением белорусской стороны о непродлении мандата офиса ОБСЕ в Минске*, http://www.mfa.gov.by/press/news_mfa/e0d1ef96f90c4a4f.html (21 V 2011).

[44] *Westerwelle und Sikorski: Wahlen in Belarus einherber Rückschlag*, http://www.auswaertiges--amt.de/DE/Infoservice/Presse/Meldungen/2010/101220-BM_Sikorski_Belarus.html?nn=-558820 (21 V 2011).

[45] *Joint statement by U.S. Secretary of State Hillary Clinton and European Union HR Catherine Ashton on the post-presidential elections' situation in Belarus*, http://eeas.europa.eu/delegations/belarus/press_corner/all_news/news/2010/2010_21_23_2_en.htm (21 V 2011).

[46] *Lukashenko the Loser – gemeinsamer Beitragder Außenminister Bildt, Schwarzenberg, Sikorski und Westerwelle*, http://www.auswaertiges-amt.de/DE/Infoservice/Presse/Interviews/2010/101223-Lukaschenko.html?nn=558820 (21 V 2011).

[47] А. В. Русакович, *op.cit.*, s. 41.

[48] *Резолюция Европейского Парламента по ситуации в Беларуси от 20 января 2011 года*, http://www.eeas.europa.eu/delegations/belarus/press_corner/all_news/news/2011/2011--0121_be.htm (15 V 2011).

аднаўляла рэжым санкцый супраць шэрагу афіцыйных асобаў Беларусі, забараняючы ўезд у шангенскую прастору для 158 асобаў[49]. МЗС Рэспублікі Беларусь адрэагавала на рашэнне Савета ЕС спецыяльнай заявай, у якой адзначалася бесперспектыўнасць даўлення на Беларусь і адначасова пацвярджалася яе зацікаўленасць ва „ўмацаванні партнёрскіх адносін з Еўрапейскім саюзам"[50].

Пасля вынясення першых судовых прыгавораў па справах аб „масавых беспарадках" у Мінску Савет міністраў замежных спраў ЕС 23 сакавіка пашырыў спіс беларускіх чыноўнікаў, якім быў забаронены ўезд на тэрыторыю краін ЕС і актывы якіх на яго тэрыторыі павінны быць замарожаны, уключыўшы ў яго дадаткова яшчэ 12 асобаў і 29 прадпрыемстваў[51]. Па стану на 1 ліпеня 2012 г. у спіс уваходзіла 243 асобы і 32 кампаніі[52].

У штогадовым пасланні беларускаму народу і парламенту, з якім выступіў А. Лукашэнка ў красавіку 2011 г., гаварылася, што ў адносінах Беларусі з ЕС наступіў тайм-аўт, які аднак доўга працягвацца не можа. Па яго словах, у гэтым „зацікаўлены ты яеўрапейцы, які яцесназвязаныя з нашай краінай". Ён прапанаваў еўрапейскім палітыкам сустрэцца ў любым месцы, кабабмеркаваць усе пытанні, якія турбуюць абодва бакі[53].

Пасля снежаньскіх падзей 2010 г. Беларусь аптымістычна ацэньвала перспектывы свайго ўдзелу ва „Ўсходнім партнёрстве"[54]. Аднак пасля заснавання Еўранесту танальнасць выказванняў беларускіх афіцыйных асобаў змянілася. 5 мая 2011 г. Прэзідыум Савета Рэспублікі і Савет Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прынялі сумесную заяву, дзе гаварылася, што беларускі парламент лічыць парламенцкую структуру „Ўсходняга партнёрства" „інструментам палітычнага ціску" і „не лічыць сябе абавязаным улічваць ці прымаць да ўвагі яе пазіцыю"[55].

---

49 *Council conclusions on Belarus. Foreign Affairs Council meeting, Brussels, 31 January 2011*, http://www.consilium.europa.eu/uedocs/cms_data/docs/pressdata/EN/foraff/119038.pdf (22 V 2011).

50 *Заявление Министерства иностранных дел Республики Беларусь в связи с принятием Советом ЕС заключений по Беларуси*, http://www.mfa.gov.by/press/statements/e2ccd3edf-69b0958.html (22 V 2011).

51 *Ibidem*.

52 Е. Кононович, *Плоды управляемой демократии*, „Союзное вече. Газета Парламентского собрания Союза Беларуси и России", 12-18 VII 2012, s. 5.

53 А. Г. Лукашенко, *Послание белорусскому народу и Национальному собранию*, http://www.president.gov.by/press116504.html#doc (22 V 2011).

54 http://www.mfa.gov.by/print/mulateral/organization/list/bel/af95209b73d93ed5.html (7 I 2012).

55 *Заявление Президиума Совета Республики и Совета Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь в связи с подписанием 3 мая 2011 года учредительных документов Парламентской ассамблеи Евронест*, http://www.sovrep.gov.by/index.php/.1.6627…0.0.0.html (23 I 2012).

Вельмі выразна супярэчнасці Беларусі з ЕС праявіліся пры правядзенні саміту „Ўсходняга партнёрства" у Варшаве 29-30 верасня 2011 г. Напярэдадні сустрэчы яе арганізатары катэгарычна адмовіліся накіраваць афіцыйнае запрашэнне прэзідэнту Беларусі А. Лукашэнку, задавальняючыся прысутнасцю на саміце міністра замежных спраў. Аднак Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь не санкцыяніраваў удзел у мерапрыемстве кіраўніка беларускага знешнепалітычнага ведамства і даручыў выступаць там ад імя Беларусі паслу Беларусі ў Польшчы В. Гайсёнку[56]. Кіраўніцтва беларускай дэлегацыяй у рангу пасла было расцэнена арганізатарам міжнароднага форуму як парушэнне дыпламатычнага этыкету. Вынікам разыходжанняў стала адмова беларускага боку ад удзелу ў саміце. У заяве беларускага МЗС гаварылася, што сваімі дзеяннямі арганізатары саміта наносяць шкоду дзеяздольнасці гэтай рэгіянальнай ініцыятывы, а рэшэнні саміта, закранаючыя інтарэсы Беларусі і прынятыя без яе згоды, з'яўляюцца нелігітымнымі[57].

Саміт Усходняга партнёрства прыняў Дэкларацыю па Беларусі, у якой пацверджаны ўмовы для вяртання да дыялогу з Мінскам, перш за ўсё вызваленне і рэабілітацыя палітычных зняволеных. Выніковая сумесная Дэкларацыя, аднак, абышлася без крытыкі беларускіх улад, супраць чаго выступілі іншыя пяць партнёрскіх краін – Украіна, Малдова, Арменія, Азербайджан і Грузія[58].

У другой палове 2011 г. у сувязі са старшынствам Польшчы ў ЕС Варшава рабіла шмат намаганняў, каб беларускае пытанне было ў цэнтры ўвагі ЕС, а таксама старалася падтрымліваць актыўны дыялог з грамадзянскай супольнасцю Беларусі. На гэтым шляху, па прызнанні польскіх афіцыйных асоб, не ўдалося дабіцца пазітыўных зрухаў з-за жорсткай пазіцыі беларускіх улад. Таксама і афіцыйны Мінск негатыўна ацаніў паўгадавы перыяд польскага старшынства, як і ў цэлым развіццё адносін паміж Беларуссю і ЕС.

Беларуска-еўрапейскія адносіны яшчэ больш накаліліся ў першыя месяцы 2012 г. ЕС перайшоў 27 лютага Рубікон, уключыўшы ў спіс невыязных прадстаўнікоў беларускага бізнесу (12 чалавек і 29 кампаній). На наступны дзень беларускія ўлады рэкамендавалі главе Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі М. Морэ і паслу Польшчы ў Беларусі Л. Шарэпку "выехаць у свае сталіцы для кансультацый, каб давесці свайму кіраўніцтву цвёрдую пазіцыю беларускага боку аб непрымальнасці даўлення і санкцый". Адпаведна ў Мінск для кансультацый былі адкліканы пастаянны прадстаўнік Беларусі пры

---

56 *Об участии официальной белорусской делегации в саммите „Восточного партнерства"*, http://www.mfa.gov.by/press/news_mfa/f2bfc4db9dd44ace.html (28 XII 2011).

57 *Заявление Министерства иностранных дел Республики Беларусь 30 сентября 2011 г.*, http://www.mfa.gov.by/press/news_mfa/b9843f846435be1c.html (28 XII 2011).

58 Л. Клысіньскі, *Мінск байкатуе Саміт Усходняга партнёрства*, http://eurobelarus.ehclients.com/content/view/23444/53/ (27 XI 2011).

ЕС А. Еўдачэнка і пасол Беларусі ў Польшчы В. Гайсёнак. Еўрасаюз назваў дзеянні беларускага боку „варожым актам" і ў адказ адклікаў ўсіх паслоў краін-членаў ЕС для кансультацый, якія пакінулі Мінск у ноч на 1 сакавіка[59]. Становішча нармалізавалася ў красавіку, калі паслы ЕС вярнуліся ў Мінск.

29 сакавіка 2012 г. Еўрапейскі парламент прыняў чарговую рэзалюцыю па Беларусі, якая асуджала пагаршэнне сітуацыі ў краіне ў галіне правоў чалавека і фундаментальных свабод, адсутнасць глыбокіх дэмакратычных і эканамічных рэформ, рэпрэсіі адносна „апанентаў рэжыму ў Мінску". Еўрапарламент вітаў рашэнне Савета міністраў ад 23 сакавіка аб пашырэнні абмежавальных мер адносна 12 асобаў і 29 прадпрыемстваў і заклікаў гэты орган ЕС надалей увязваць сітуацыю з правамі чалавека з выкарыстаннем абмежавальных мер, у тым ліку кропкавых эканамічных санкцый. Еўрадэпутаты адзначылі, што сумеснае рашэнне краін ЕС адклікаць сваіх паслоў з Беларусі прадэманстрыравала правал спробаў беларускіх улад падзяліць Еўрасаюз у сувязі з яго рашэннем аб санкцыях. Рэзалюцыя выказвалася за тое, каб ЕС „рашуча падтрымліваў цеснае ўзаемадзеянне" з прадстаўнікамі грамадзянскага грамадства і дэмакратычнай апазіцыяй у Беларусі, а таксама „дэмакратычныя намаганні беларускага народа"[60].

У выступленні з пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу 8 мая 2012 г. прэзідэнт А. Лукашэнка пацвердзіў, што ЕС з'яўляецца адным з важнейшых вектараў для Беларусі: і эканамічна, і палітычна. Звяртаючыся да снежаньскіх падзей 2010 г., ён сказаў, што пасля выбараў Беларусь разлічвала ісці ранейшым шляхам – наладзіць дыялог з Еўропай і ЗША, развіваць грамадскую супольнасць, унутрыпалітычны дыялог, удасканальваць палітычную сістэму. „Але Захад і наша пятая калона вырашылі інакш. Яны не проста адмовіліся ад дыялога, але пачалі атаку на нашу краіну праз націск і санкцыі". Адзначыўшы, што гэта шлях у тупік, дакладчык канстатаваў: „З-за дзіўнай еўрапейскай палітыкі страчана шмат часу, але наша пазіцыя застаецца ранейшай – мы гатовы да дыялогу"[61]. Менавіта такім шляхам трэба пераадольваць рознагалоссі, а не санкцыямі і забаронамі. А. Лукашэнка назваў санкцыйную палітыку памылковай, таму што яна дарэмная і безвыніковая.

Закрануўшы пытанне, з кім Беларусь (Усходам ці Захадам) ці тэму так званых „беларускіх арэляў", дакладчык назваў такія падыходы застарэлым

[59] *Страны ЕС отзывают своих послов из Беларуси*, http://news.tut.by/politics/276600.html (16 IV 2012); *ЕС обнародовал черный список из 12 человек и 29 компаний*, http://news.tut.by/politics/280743.html (29 III 2012).

[60] *Опубликован полный текст резолюции Европарламента по Беларуси [30 III 2012]*, http://news.tut.by/politics/281744.html (4 IV 2012).

[61] *Беларусі шлях: патрыятызм, інтэлект, прагрэс. Прэзідэнт выступіў з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу*, „Звязда", 10 V 2012, s. 2.

прыкладам прымітыўнага мыслення. Няма ніякіх арэляў – ёсць аб’ектыўныя інтарэсы краіны. Вялікія саюзы, на мяжы якіх знаходзіцца Беларусь (маюцца на ўвазе Еўрапейскі Саюз і Еўразійскі Саюз, які фарміруецца), на яго думку, не павінны быць варожымі адзін аднаму, не дзяліць кантынент, а аб’ядноўваць яго. „Зыходзячы з гэтага, Беларусь вылучае ідэю інтэграцыі інтэграцый. Яе мэта – стварэнне агульнай эканамічнай прасторы ад Лісабона да Уладзівастока”[62] – заявіў А. Лукашэнка.

23 сакавіка 2012 г. Савет ЕС ухваліў праграму „Еўрапейскі дыялог аб мадэрнізацыі Беларусі”, якая прадугледжвае шматбаковы абмен поглядамі і ідэямі паміж ЕС і прадстаўнікамі беларускай грамадзянскай супольнасці і палітычнай апазіцыі аб неабходных рэформах у Беларусі і развіцці яе адносін з ЕС. Дыялог сканцэнтраваны на чатырох ключавых сферах адносін: палітычная рэформа; рэформа судовай сістэмы і чалавечыя кантакты; пытанні эканамічнай і галіновай палітыкі; гандаль і рыначныя рэформы. Афіцыйны Мінск адмовіўся ад удзелу ў праграме. Пасол у Бельгіі, пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры ЕС А. Еўдачэнка заявіў журналістам 9 ліпеня 2012 г., што Беларусь будзе працаваць у рамках тых сумесных праграм з ЕС, якія распрацоўваюцца і ўзгадняюцца з беларускім бокам[63].

15 кастрычніка 2012 г. Савет міністраў замежных спраў ЕС прыняў рашэнне працягнуць дзеянне санкцый адносна беларускіх улад да 31 кастрычніка 2013 г. Працяг санкцый абумоўлены тым, што не ўсе палітычныя вязні былі вызвалены і ніхто з іх не быў рэабілітаваны, а таксама ў сувязі з адсутнасцю паляпшэння спраў у галіне правоў чалавека[64]. Прэс-сакратар МЗС Беларусі А.Савіных адзначыў, што рашэнне ЕС замаражвае адносіны паімж Беларуссю і ЕС на ўзроўні, які аб’ектыўна не можа задавальняць ніводзін з бакоў. Ён заклікаў ЕС адмовіцца ад санкцыйнага мыслення і зрабіць намаганні для аднаўлення атмасферы ўзаемнага даверу[65].

Уступленне Беларусі ў Мытны саюз і ўтварэнне Адзінай эканамічнай прасторы разам з Расіяй і Казахстанам здымала пытанне аб падпісанні ёю пагадненняў аб утварэнні Зоны паглыбленага свабоднага гандлю з ЕС. Разам з тым Беларусь у якасці члена Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана выступае за пачатак збліжэння Мытнага саюза і Еўрасаюза на базе

---

62 *Ibidem.*

63 *Делегация Европарламента по связям с Беларусью подведет итоги „диалога о модернизации”*, http://naviny.by/rubrics/eu/2013/03/20/ic_news_627_413098 (20 VIII 2013).

64 *МИД: Решения Совета ЕС замораживают отношения Минска с Брюсселем*, http://udf.by/news/politic/68003-mid-resheniya-soveta-es-zamorazhivayut-otnosheniya-minska-s (26 VII 2013).

65 *Комментарий начальника управления информации, пресс-секретаря МИД Беларуси Андрея Савиных в связи с решением Совета ЕС по Беларуси от 15 октября 2012 г.*, http://www.mfa.gov.by/print/press/news_mfa/ecd07443f68d4150.html (26 VII 2013).

адзінай інтэграцыйнай платформы паступальнай узаемнай гарманізацыі нарматыўнай сферы і лібералізацыі гандлю паміж двума інтэграцыйнымі аб'яднаннямі. У якасці кроку ў напрамку фарміравання такой платформы Беларусь, Расія і Казахстан у лістападзе 2010 г. прынялі ўдзел у афіцыйных перагаворах аб стварэнні зоны вольнага гандлю з краінамі-членамі Еўрапейскай асацыяцыі вольнага гандлю (Ісландыяй, Ліхтэнштэйнам, Нарвегіяй і Швейцарыяй), цесна інтэграванымі з Еўрасаюзам у рамках Еўрапейскай эканамічнай прасторы[66].

## Гандлёва-эканамічныя сувязі

Важнейшай сферай адносін Беларусі з краінамі ЕС з'яўляецца гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. ЕС – другі пасля Расійскай Федэрацыі важнейшы гандлёвы партнёр Беларусі. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з ЕС характарызуецца высокай дынамікай і на працягу апошніх 15 гадоў выйшла на якасна новы для Беларусі ўзровень. У сярэдзіне 1990-х гадоў доля краін ЕС у агульным тавараабароце Беларусі складала каля 8-10 %, у 2000 г. – больш 13 %, у 2012 г. – 29,5 % (у 2009 г – амаль 32 %[67]). У 1995--2010 гг. гандлёвы абарот Беларусі з краінамі ЕС павялічыўся ў 10 разоў, а беларускі экспарт у ЕС – больш чым у 20 разоў. У 2007-2011 гг. краіны ЕС устойліва займалі першае месца па аб'емах беларускага экспарта, істотна апярэджваючы па даным показчыку Расію, што займала другое месца[68].

Гандаль з краінамі ЕС характарызаваўся, пачынаючы з 2003 г., істотным станоўчым сальда для Беларусі, якое дасягнуля ў 2012 г. больш 8 млрд дол. ЗША. Агульны аб'ём тавараабарота паміж Беларуссю і 27 краінамі – членамі ЕС склаў у 2012 г. 27,1 млрд дол. ЗША, у тым ліку беларускіэкспарт 17,6, а імпарт – 9,5 млрд дол. ЗША[69].

Эксперты, адзначаючы рэкордны аб'ём экспарта, які дасягнула Беларусь у 2011 г., падкрэсліваюць, што ён быў шмат у чым забяспечаны за кошт паставак беларускай прадукцыі ў краіны ЕС, перш за ўсё нафтапрадуктаў і нават нафты. Прычыны роста беларускага экспарта заключаліся ў тым, што Беларусь амаль на 40 % павялічыла імпарт нафты з Расіі дзякуючы ўрэгуляванні з ёю нафтавай спрэчкі, што дазволіла нарасціць экспарт нафта-

[66] http://www.mfa.gov.by/print/mulateral/organization/list/bel/af95209b73d93ed5.html (7 I 2012).

[67] http://www.mfa.gov.by/print/bilateral/europe/bel/ (26 II 2012); *Итоги внешней торговли Республики Беларусьза январь-декабрь 2012 г.*, http://www.gtk.gov.by/ru/stats/itogi_vnesh_torgovli2012/yanv_dek2012 (26 VII 2013).

[68] http://www.mfa.gov.by/mulateral/-organizations/list (7 III 2011).

[69] *Итоги внешней…*

прадуктаў у ЕС. Так, фізічны аб’ём экспарта нафтапрадуктаў у Нідэрланды павялічыўся з 5 млн т у 2010 г. да 7,2 млн т у 2011 г., у Латвію – з 853 тыс. т да 1,9 млн т, у Италію – з 182 тыс. да 653,6 тыс. т. Павелічэнню экспартнай выручкі садзейнічаў і рост сярэдняйцаны на нафтапрадукты на знешніх рынках у 2011 г. на 35%. Пералічаныя фактары дазволілі Беларусі істотна павялічыць аб’ём экспарта ў краіны ЕС і забяспечыць прырост пазітыўнагаксальда ў гандлі з Захадам[70].

У той жа час гандлёвыя патокі ЕС з Беларуссю нязначныя (0,1% аб’ёму гандлю ЕС)[71]. Польскі даследчык А. Думала адзначае, што ўзаемныя гандлёвыя адносіны цяжка лічыць значнымі і развітымі. Ён гаворыць пра маргінальны ўдзел Беларусі ў агульным імпарце (0,31 %) і экспарце (0,39 %) ЕС (па дадзеных на 2007 г.). Беларусь займала тады 45 месца (47 па імпарту і 40 па экспарту) сярод важнейшых гандлёвых партнёраў ЕС, у той час, як ЕС з’яўляецца, як ужо адзначалася, другім пасля Расіі гандлёвым партнёрам Беларусі (другое месца па імпарту і першае па экспарту)[72]. Абагульняючы гандлёвыя адносіны паміж Беларуссю і ЕС, польскі аўтар канстатуе, што „значэнне і прывабнасць Беларусі як гандлёвага партнёра ЕС з’яўляюцца пагэтаму вельмі малымі”[73].

Да ліку еўрапейскіх краін, з якімі Беларусь мае найбольш развітыя гандлёва-эканамічныя сувязі, адносяцца Германія, Польшча, Нидэрланды, Латвія, Італія, Літва, Бельгія, Францыя, Вялікабрытанія, Чэхія, Швецыя, Венгрыя. У 2011 г. вядучыя пазіцыі сярод краін-імпарцёраў беларускай прадукцыі займалі Нідэрланды – 15,3 % ад усяго аб’ёма беларускага экспарта (другое месца пасля Расіі, на якую прыходзілася 34 % усяго аб’ёма экспарта), Латвія – 7,8 %, Германія – 4,5 %, Польшча – 2,8 %, Літва – 2,1 % усяго аб’ёма экспарта. Галоўнымі пастаўшчыкамі прадукцыі ў Беларусь сярод краін ЕС у 2011 г. былі: Германія – 5,6 % ад усяго аб’ёма імпарта (другое месца пасля Расіі, на якую прыходзілася 54,5 % усяго аб’ёма імпарта), Польшча – 2,8 %, Італія – 2,1 %, Францыя – 0,9 % усяго аб’ёма імпарта[74]. У 2012 г. 2-е месца ў агульным тавараабароце краіны займалі Нідэрланды – 8,8 %, 4-е Германія – 4,9 %, 5-е – Латвія – 3,7 %, 7-е Польшча – 2,6 %[75].

---

70 Д. Заяц, *Экспортное чудо Беларуси: как страна покорила Евросоюз*, http://news.tut.by/economics/275896.html?utm_source=news-left-block&utm_medium=popular-news&utm_campaign=popular-news (26 II 2012).

71 *ЕС і Беларусь: Гандлёвыя адносіны ЕС-Беларусь*, http://www.delblr.ec.europa.eu/page1184.html (7 III 2009).

72 A. Dumała, *op.cit.*, s. 292.

73 *Ibidem*, s. 293.

74 *Внешняя торговля Беларуси в 2011 году*, http://belstat.gov.by/homep/ru/indicators/ftrade1.php (26 II 2012).

75 *Итоги внешней…*

Паміж Беларуссю і еўрапейскімі краінамі дзейнічаюць 11 міжурадавых камісій па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. У 2010 г. з краін ЕС у Беларусь паступіла 2,14 млрд. доляраў інвестыцый (24 % ў агульным аб'ёме інвестыцый), у тым ліку 343 млн. доляраў прамых інвестыцый[76]. Асноўнымі краінамі-інвестарамі ў беларускую эканоміку з'яўляюцца Швейцарыя, Аўстрыя, Вялікабрытанія, Кіпр, Нідэрланды, Германія[77].

Беларусь экспартуе у ЕС больш за 700 відаў таварных пазіцый, сярод якіх дамініруюць нафтапрадукты, сырая нафта, звадкаваны газ, паўфабрыкаты з углеродзістай сталі, каліўныя ўгнаенні, лесаматэрыялы, трактары, трубы і профіль, медыцынскія прыборы, аўтамабільныя шыны. Нафта, нафтапрадукты і газ складалі ў 2007 г. больш 56 % экспарту. З краін ЕС увозіцца больш за тысячу відаў тавараў, з якіх пераважаюць легкавыя аўтамабілі і іншыя транспартныя сродкі, вытворчае абсталяванне, сельскагаспадарчая тэхніка і трактары, запчасткі для аўтамабіляў і трактароў, лекарственныя сродкі[78]. Доля машын і транспартнага абсталявання складала ў 2007 г. 43 % беларускага імпарту з ЕС.

ЕС з'яўляецца буйнейшым донарам тэхнічнай дапамогі Рэспубліцы Беларусь, якая аказвалася раней праз Праграму Тэхнічнага садзейнічання краінам СНД (TACIC). За гады дзейнасці TACIC у Беларусі (1991-2006 гг.) рэалізавана больш 420 праектаў на суму больш 210 млн еўра, ці больш 40 % ад усёй замежнай тэхнічнай дамапогі, якую атрымала Беларусь з 1991 г.[79]. Разам з тым трэба адзначыць, што Беларусь да цяперашняга моманту атрымала значна менш фінансавай дапамогі, чым яе суседзі[80].

Як адзначалася, 21 чэрвеня 2007 г. ЕС увёў прынятае Саветам ЕС 20 снежня 2006 г. рашэнне аб часовым прыпыненні адносна Беларусі дзеяння АСП ЕС. Гэты крок быў зроблены ў сувязі з парушэннем беларускімі ўладамі правоў незалежных прафсаюзаў і невыкананнем імі рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы. Прэс-служба МЗС Рэспублікі Беларусь прыняла заяву на гэты конт, у якой расцаніла гэты "недальнабачны крок" як накіраваны супраць інтарэсаў шэраговых членаў беларускіх прафсаюзаў на прадпрыемствах, што выпрабляюць экспартуемую ў ЕС прадуцыю. У заяве

---

76 http://www.mfa.gov.by/print/bilateral/europe/bel/ (26 II 2012).

77 *ЕС і Беларусь…*

78 *Ibidem.*

79 В. Ф. Белицкий, С. Д. Березовский, Е. В. Одинец, А. А. Шмелев, *Участие Беларуси в инстументах внешней помощи Европейского Союза*, [w:] *Беларусь в современном мире = Беларусь у сучасным свеце…*, s. 127-128; *Доноры международной технической помощи Республике Беларусь. Справочник*, В. Ф. Белицкий (сост.), Минск 2009, s. 58.

80 *Ініцыятывы Еўрапейскай камісіі ў галіне дапамогі Беларусі*, http://www.delblr.ec.europa.eu/page1184.html (7 III 2009).

гэта рашэнне разглядалася як часовае, аднак яно не адменена па сённяшні дзень[81].

У студзені 2010 г. адбыўся рабочы візіт у Беларусь дэлегацыі Еўрапейскай камісіі, у рамках якога прайшлі перагаворы па пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЕС. Беларускі бок звярнуў увагу на неабходнасць аднаўлення з ЕС рэжыму найбольшага спрыяння ў гандлі з Беларуссю, фарміравання заканадаўчых і інстытуцыянальных асноў умацавання эканамічных адносін паміж ЕС і Беларуссю. Было адзначана, што ў выніку выключэння Рэспублікі Беларусь з АСП ЕС беларускія экспарцёры нясуць дадатковыя эканамічныя страты (каля 300 млн. дол. штогод). У гэтай сувязі беларускі бок заклікаў Еўрапейскую камісію зняць дзеючыя дыскрымінацыйныя абмежаванні ў двухбаковым гандлі, уключаючы аўтаномнае квацiраванне экспарта ў ЕС асобных катэгорый беларускіх тэкстыльных вырабаў і адзення[82].

ЕС аказавае тэхнічную дапамогу Беларусі ў наступых галінах: ахова навукольнага асяроддзя, абсталяванне памежнай інфраструктуры, сацыяльная абарона, ядзерная бяспека, барацьба з нелегальнай міграцыяй і контрбандай, адукацыя, мясцовае кіраванне. Наша краіна таксама ўдзельнічае ў рэалізацыі трох праграм добрасуседства ЕС: „Польшча – Украіна – Беларусь", „Латвія – Літва – Беларусь", „Рэгіён Балтыйскага мора". На рэалізацыю гэтых праграм Еўрапейскі саюз выдзеліў для Беларусі і іншых краін, што бяруць у іх удзел (Расія і Украіна) па лініі ТАСІС каля 19 млн еўра. З 1 студзеня 2007 г. замест Праграмы ТАСІС Еўрапейскі Саюз увёў у дзеянне новы Еўрапейскі інструмент добрасуседства і партнёрства (ЕІДП), у рамках якога Беларусь будзе супрацоўнічаць з памежнымі дзяржавамі-членамі ЕС па фармату новых праграм трансгранічнага супрацоўніцтва[83]. У рамках ЕІПД на 2007-2011 гг. для Беларусізарэзірвавана каля 43 млн еўра. Яшчэ 64 млн еўраплануеццавыдзеліць у 2012-2013 гг. Па стане на пачатак 2012 г. у стадыірэалізацыі ў Беларусізнаходзяцца 17 праектаў ЕС на агульную суму 10,5 млн еўра. Беларусь удзельнічае ў 15 праграмах ЕІДП на нацыянальным, рэгіянальным і трансмежнымузроўнях. Паводле звестак беларускага МЗС, дадзеная дапамога з'яўляецца бязвыплатнай і накіравана на фінансаванне супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЕС па ўзаемавыгодных напрамках. За кошт адзначаных сродкаў ажыццяўляецца ўладкаванне дзяржаўнай мяжы

[81] *Заява Прэс-службы МЗС Рэспублікі Беларусь у сувязі з набыцём моцы Рашэння Савета ЕС аб часовым прыпыненні ў адносінах да Беларусі дзеяння Абагуленай сістэмы гандлёвых прэферэнцый (АСП) ЕС ад 21 чэрвеня 2007 г.*, „Веснік Міністэрства замежных спраў [РБ]" 2007, №2, s. 20-21.

[82] *Об итогах визита в Республику Беларусь делегации Еврокомиссии во главе с П. Балашем*, http://www.mfa.gov.by/print/ru/press/news/c5e716c7de1ebe87.html/ (7 III 2010).

[83] http://www.delblr.ec.europa.eu/page1190.html (7 III 2009).

Беларусі з краінамі ЕС, мадэрнізацыя нацыянальнай памежнай і мытнай інфраструктуры, абмен перадавым вопытам і рэалізацыя пілотных праектаў у энергетычнай, транспартнай, аграхарчовай, прыродаахоўнай, адукацыйнай, культурнай і іншых прыярытэтных сферах[84].

## Падсумаванне

20-гадовая гісторыя адносін паміж Беларуссю і Еўрапейскім Саюзам падзяляецца на два перыяда, мяжой паміж якім выступае лістапад 1996 г. На працягу першага перыяду беларуска-еўрапейскія адносіны развіваліся з нарастаючым дынамізмам і былі ўвенчаны падпісаннем Пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве, якое аднак не ўступіла ў сілу па сённяшні дзень. Другі перыяд пачаўся пасля лістападаўскага рэферэндума 1996 г., вынікі якога не былі прызнаны ЕС і яго дзяржавамі-членамі. Пасля рэферэндума ў беларуска-еўрапейскіх адносінах наступіў адкат, назіралася чаргаванне этапаў пацяплення і ахалоджвання. Агульны стан гэтых адносін можна было называць ненармальным, параўноўваючы яго з дасягненнямі першай паловы 90-х гадоў і ўзроўнем адносін ЕС з іншымі еўрапейскімі краінамі--нечленамі ЕС.

Пасля падзей, што адбыліся ў Беларусі 19-20 снежня 2010 г. адносіны Беларусі з ЕС, як і ўвогуле з дзяржавамі Захаду, аказаліся адкінутымі да ўзроўню, які аказаўсяы ніжэйшым за той, з якога пачынаўся адлік падзей пасля лістападаўскага рэферэндума 1996 г. Для таго, каб бакам зноў вярнуцца да больш-менш прымальнага ўзроўню адносін, спатрэбіцца нямала часу і цярпення. Ім прыйдзецца зноў прайсці неабходную фазу нармалізацыі і аднаўлення даверу, падобную той, што была ў 2008-2010 гг.

Гісторыя адносін ЕС з Беларуссю паказавае, што ні стратэгія дыялогу з афіцыйным Мінскам, ні яго дыпламатычная ізаляцыя не прынеслі чакаемых Супольнасцю вынікаў у выглядзе рэальнай дэмакратызацыі беларускага грамадскага жыцця. Дыялог праводзіўся на падставе прынцыпа выканання пэўных умоў, аднак на практыцы значна большыя выгады з гэтага атрымаў А. Лукашэнка, які абмежаваўся дробнымі і сімвалічнымі саступкамі ў галіне дэмакратызацыі.

У бліжэйшай і сярэднетэрміновай перспектыве ЕС наўрадці будзе ў стане сфармуляваць для Беларусі прапанову, якая б адцягнула яе ад Расіі. Апошняя значна больш важная для ЕС, паколькі мае статус стратэгічнага партнёра. Яна дала і працягвае даваць краіне непараўнальна больш, чым

84 http://www.mfa.gov.by/print/mulateral/organization/list/bel/af95209b73d93ed5.html (7 I 2012).

ЕС. Беларусь можа быць толькі мастом у адносінах паміж Расіяй і ЕС і карыстацца дабротамі ЕПС.

Зыходзячы са стратэгічнай мэты забеспячэння добрасуседства на сваіх знешніх межах, ЕС будзе працягваць палітыку ўцягвання Беларусі ў праграму Усходняе партнёрства і канкрэтныя рэгіянальныя праекты. Пры гэтым ЕС, як можна заўважыць, будзе мацней увязваць свае эканамічныя праграмы і дапамогу Беларусі з яе прагрэсам у палітычнай сферы. Палітычныя патрабаванні, перш за ўсё дэмакратызацыю, Брусель цвёрда намераны супрацьставіць “прагматызму” беларускай знешняй палітыцы, накіраванаму выключна на рэалізацыю “другога кошыка” (фінансава-эканамічнага), які для Мінска з’яўляецца прыярытэтам нумар адзін у адносінах з Захадам.

Пасля снежаньскіх падзей 2010 г. ЕС у сваёй палітыцы да Беларусі рабіла большы акцэнт на стварэнне і ўмацаванне градзянскайсупольнсці, імкнучыся шырэй паспаўсюджваць дэмакратычныя каштоўнасці сярод беларускага грамадства. Адным з найбольш эфектыўных сродкаў для гэтага было б спрашчэнне візавага рэжыму паміж ЕС і Беларуссю, падтрымка незалежных СМІ, інтэнсіфікацыя абменаў моладзю і іншымі катэгорыямі насельніцтва. Адносна беларускіх улад ЕС галоўнай умовай аднаўленнння дыялогу лічыць іх схіленне да вызвалення і рэабілітацыі ўсіх палітзняволеных і людзей, што трапілі пад судовыя працэсы па справе 19 снежня 2010 г. Доўгатэрміновай мэтай ЕС застаецца дэмакратызацыя Беларусі, якая патрабуе як значнага пашырэння дапамогі градзянскайсупольнасці, так і паслядоўнага прымянення палітыкі вылучэння ўмоў афіцыйнаму Мінску.

## Summary

Vladimir E. Snapkovsky

### The development of mutual relations between Belarus and the European Union at the beginning of XXI century

The article analyses the economic and political relationship between the Republic of Belarus and the European Union in the beginning of the XXI century. The author examines the events from the beginning of the new EU „step by step" policy towards Belarus (at the turn of 2001-2002) to the end of the year 2012 when the relationship between Belarus and EU were in a frozen state. The official position of Minsk is being viewed as well as the official position of Brussels during the „step by step" strategy of EU (2002-2008), thaw (2008-2010) and during the period of the mutual pullback in relations which occurred after the 2010 December events in the capital of Belarus. The development of trade and economic relations

between Belarus and EU is also shown. In the end of the article conclusions are made and the possible relationships development options, made by the European Union, are outlined.

**Vladimir E. Snapkovsky** – dr hab. nauk historycznych, profesor na Wydziale Stosunków Międzynarodowych Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku